21. Паўлюкавец, А.А. Эсперанта-беларускі слоўнік / А.А. Паўлюкавец // Мова эсперанта: практычны дапам. / А.А. Паўлюкавец. – Мінск : Нав. і тэх., 1992. – С. 132–58.

22. Станкевіч, Я. Слоўнічак / Я.Станкевіч // Родная мова. – [Ч. 1] –1930. – №5. – С. 110–112.

23. Шидловский, А.В. Русско-белорусский словарь «Ложных друзей переводчика» / А.В. Шидловский // Лингвистические проблемы перевода на белорусский язык. – Мінск : Выш. шк., 1978. – С. 55–89.

24. Шур, В.В. Спіс найбольш вядомых беларускіх імёнаў, іх варыянты, паходжанне, значэнне / В.В. Шур // Беларускія ўласныя імёны: дапам. для настаўнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1998. – С. 233–238.

25. Яўневіч, М.С. Кароткі руска-беларускі слоўнік / М.С. Яўневіч, У.К. Андрэенка // Беларуская мова : падруч. для 5–6 (з выд. 12: 6–7) кл. 8-гадовай і сярэд. шк. з рус. м. навуч. / М.С. Яўневіч, У.К. Андрэенка. – 15-е выд., дапрац. – Мінск : Нар. асвета, – 1994. – С. 294–297.

УДК 811.161.3:378.147

Т.П. Гулицкая, ст. выкл. (БДТУ, г. Мінск)

## РАЗВІЦЦЁ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

Адукацыйная парадыгма ў ВНУ адлюстроўвае неабходнасць удасканалення падрыхтоўкі спецыяліста, здольнага да самаактуалізацы, кампетэнтнага ў прафесійнай і камунікатыўнай сферы. Вынікам сучаснай адукацыі становяцца набытыя кампетэнцыі, г. зн. жаданне, уменне і гатоўнасць выпускнікоў выконваць прафесійныя абавязкі, што дазваляе выкладчыкам фарміраваць канкурэнтаздольнага спецыяліста, які можа хутка адаптавацца ў новых умовах працы, зменлівых нават у рамках адной прафесіі. Вырашэнне ў працэсе навучання шматвектарных адукацыйных задач магчыма пры кампетэнтнасным падыходзе, згодна з якім, у якасці выніку адукацыі выступае фарміраванне кампетэнцый – цэласнай сістэмы ўніверсальных ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама вопыту самастойнай прафесійнай дзейнасці студэнтаў. Пры гэтым развіццё прафесійнай камунікатыўнай кампетэнтнасці застаецца адной з галоўных умоў паспяховай сацыялізацыі выпускніка тэхнічнай ВНУ, а фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі ў студэнтаў – важнейшай задачай ў працэсе выкладання прадметаў гуманітарнага цыкла.

Пад прафесійнай камунікатыўнай кампетэнтнасцю як складнікам прафесійнай кампетэнтнасці неабходна разумець інтэгратыўную якасць асобы спецыяліста, якая фарміруецца на аснове кампетэнтнаснага і інтэгратыўнасці падыходаў шляхам рэалізацыі ўзаемасувязі спецыяльных і лінгвістычных ведаў, прафесійных і камунікатыўных уменняў і навыкаў, неабходных для ажыццяўлення камунікатыўнай дзейнасці ў межах прафесійнай сферы зносін [1].

Тэрмін «камунікатыўная кампетэнцыя» вызначаецца як «здольнасць навучэнца да ўспрымання любых выказванняў; яго гатоўнасць да стварэння сваіх маўленчых тэкстаў у адпаведнасці з ведамі, уменнямі, практычным вопытам, прынятымі нормамі мовы, асобаснымі якасцямі, з выкарыстаннем невербальных сродкаў; яго ўменні арыентавацца ў прасторы, сітуацыі, улічваючы тэму, мэту, задачы, камунікатыўныя і этычныя ўстаноўкі, а таксама дасягаць прафесійных вынікаў пры дапамозе маўлення» [3, с. 12].

З мэтай развіцця маўленчых навыкаў студэнтаў, авалодання імі маўленнем у навучальнай, культурнай, пазнавальнай, і іншых сферах жыццядзейнасці ва ўмовах сучаснага беларуска-рускага (руска-беларускага) білінгвізму ва ўсіх вышэйшых навучальных установах выкладаецца дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Згодна з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі засваенне студэнтамі дадзенай дысцыпліны забяспечвае фарміраванне шэрага вучэбных кампетэнцый. Складанасць рэалізацыі пастаўленых у праграме задач заключаецца не толькі ў тым, што на яе рэалізацыю адводзіцца адносна невялікая колькасць гадзін (ад 34 да 36 гадзін), але і ў тым, што большасць студэнтаў адчуваюць цяжкасці камунікатыўнага характару, што выяўляецца ў нізкай маўленчай культуры, у няздольнасці падтрымліваць прафесійныя зносіны на беларускай мове, у складанасці вуснага выступлення па абранай тэме, у наяўнасці вялікай колькасці маўленчых і граматычных памылак у пісьмовым і вусным маўленні.

Неабходнасць развіцця эфектыўнай маўленчай камунікацыі будучых спецыялістаў для паспяховага вырашэння задач у прафесійнай і сацыякультурнай сферах ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму вымагае, у сваю чаргу, пошуку аптымальных форм, метадаў і прыёмаў навучання. У працэсе фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі студэнтаў мэтазгодна выкарыстоўваць актыўныя метады навучання, якія «дазваляюць адначасова рашаць некалькі задач: яны развіваюць камунікатыўныя ўменні і забяспечваюць рашэнне адукацыйных задач, прывучаюць працаваць у групах» [2, с. 5]. Актыўныя формы навучання выбіраюцца з улікам мэты навучальня, зместу вучэбнага матэрыялу, прафесійнай

спецыялізацыі студэнтаў. Пры гэтым ў якасці камунікатыўных адзінак навучання выкарыстоўваюцца прафесійна-арыентаваныя навукова-тэхнічныя тэксты, якія карэлююцца з тэматыкай і лексікай профільных дысцыплін. Работа з тэкстамі, розныя віды перакладу тэкстаў тэхнічнага і тэхналагічнага зместу, міжмоўнае білінгвальнае супастаўленне адпаведнікаў у рускай і беларускай мовах, асабліва пры вывучэнні беларускай навуковай тэрміналогіі, садзейнічаюць не толькі ўзбагачэнню слоўнікавага запасу будучых спецыялістаў, але і вырашаюць вялікі дыяпазон навучальных задач.

Камунікатыўная кампетэнцыя школьніка не з’яўляецца тоеснай камунікатыўнай кампетэнцыі студэнта, бо навучанне ў ВНУ накіравана на ўдасканаленне яго прафесійнай падрыхтоўкі. Таму пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» улічваецца будучая спецыяльнасць студэнтаў, пры гэтым асаблівая ўвага надаецца развіццю прафесійна-арыентыраваннай камунікатыўнай кампетэнцыі. Развіццё камунікатыўных уменняў будучых спецыялістаў на аснове умення ствараць вусныя і пісьмовыя тэксты розных тыпаў, стыляў і жанраў найбольш поўна магчыма рэалізаваць пры вывуэнні тэм «Функцыянальныя стылі маўлення» і «Культура прафесійнага маўлення», калі студэнтам прапануецца работа з пісьмовымі прафесійна-арыентаванымі тэкстамі, а прадугледжаныя праграмай тэмы вуснага маўлення маюць на мэце развіццё маўленчага вопыту ў адпаведнасці з прафесійнай спецыялізацыяй студэнтаў.

Вывучэнне дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» садзейнічае не толькі развіццю камунікатыўнай кампэтэнцыі, але і выступае сродкам павышэння прафесійнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Зимняя, И. А. Ключевые компетентности как результативно-целевая основа компетентностного подхода в образовании / И. А. Зимняя. – Москва : Исслед. центр проблем качества подготовки специалистов, 2004. – 38с.

2. Смирнова, Е. А. Формирование коммуникативной компетентности студентов в условиях непрерывного образования : автореф. дис. … доктора педагогических наук : 13.00.01 / Е. А. Смирнова ; Мос.гос.гум.ун-т, М., 2007. –38 с.

3. Стурикова, М. В. Коммуникативная компетенция и ее развитие у студентов вуза в условиях преемственности образования / М. В. Стурикова. – Екатеринбург: Изд-во Рос. гос. проф.-пед. ун-та, 2020. –164 с.